✓**28 студзеня** ў НББ адкрылася літаратурна-мастацкая выстава **«Каб чалавек жыў як чалавек...»**, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння пісьменнікаў Івана Мележа і Івана Шамякіна.

Мэта выставы – аддаць даніну павагі летапісцам эпохі, нагадаць аб творчасці мастакоў слова, зацікавіць чытачоў творамі аўтараў. У экспазіцыі прадстаўленыя выданні твораў І. Мележа і І. Шамякіна з фондаў бібліятэкі, першыя з іх, самыя рэдкія, юбілейныя, з аўтографамі майстроў слова, у перакладзе, з выдатна аформленымі вокладкамі і ілюстрацыямі знакамітых мастакоў. Дапаўняюць экспазіцыю ілюстрацыі да твораў пісьменнікаў. Можна пазнаёміцца з лінагравюрамі Наталлі Паплаўскай да рамана І. Мележа «Людзі на балоце» з фондаў НББ, прадстаўленыя ілюстрацыі да твораў і выданняў абодвух празаікаў Арлена Кашкурэвіча, Людвіга Асецкага, Сяргея Раманава, Эдуарда Агуновіча, Мікалая Гаева і інш.